*Дзяніс* ЛІСЕЙЧЫКАЎ

# "Пяць галоўных штурмаў...": духоўны тастамент мітрапаліта Кіеўскага, Галіцкага і Усёй Русі Іосіфа Вельяміна-Руцкага 1627 года

*Знаходкі дакументаў, уласнаручна складзеных дзяржаўнымі і культурнымі дзеячамі розных эпох, заўсёды выклікаюць павышаную цікавасць. Асабліва важным і інфарматыўным відам* ***эга-дакументаў*** *з'яўляюцца тастаменты (завяшчанні) — акты апошняй волі чалавека. Эмацыйна і літаратурна аздобленыя, яны дазваляюць у прамым сэнсе паглядзець на рэчы і падзеі вачыма сваіх аўтараў. У фондах Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (г. Санкт-Пецярбург) захоўваецца тастамент уніяцкага мітрапаліта Кіеўскага, Галіцкага і Усёй Русі Іосіфа Вельяміна-Руцкага, аднаго з самых вядомых рэлігійных і культурных дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага першай трэці XVII ст., актыўнага ўдзельніка міжканфесійнай палемікі, таленавітага публіцыста і літаратара. Хоць асобе мітрапаліта прысвечана нямала прац у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, змест гэтага тастамента дагэтуль невядомы шырокай навуковай грамадскасці. Публікацыя яго поўнага тэксту дазволіць узбагаціць нашую барочную літаратуру яшчэ адным каштоўным творам.*

Асоба мітрапаліта Іосіфа Вельяміна-Руцкага займае надзвычай важнае месца ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Усходняй Еўропы ў цэлым. Між тым да апошняга часу раннія факты яго біяграфіі былі практычна невядомыя, што дазваляла выказваць аб паходжанні мітрапаліта самыя розныя (часам фантастычныя) гіпотэзы. Аднак знаходка намі дзесяць гадоў таму ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі фрагмента архіва родавага маёнтка Вельямінаў Руты[1] дазволіла адказаць на шэраг важных пытанняў. Стала зразумелым, што род Вельямінаў (альбо Вельямінавічаў) мог мець татарскае паходжанне, а яго прадстаўнікі жылі на тэрыторыі Навагрудскага павета як мінімум з канца XV ст., а не прыбылі з Маскоўскай дзяржавы ў сярэдзіне XVI ст. Была ўдакладнена дата нараджэння будучага мітрапаліта, устаноўлены яго родавы герб і складзены максімальна поўны радавод Вельямінавічаў.

У цудам адшуканым фрагменце архіва маёнтка Рута знойдзены і ўласнаручна напісаны мітрапалітам тастамент, складзены ім у сваім родавым маёнтку ў 1636 г., незадоўга да смерці, што было значным навуковым адкрыццём[2]. Паводле гэтага тастамента вырашаліся ўсе эканамічныя пытанні, звязаныя з размеркаваннем мітрапалітавай спадчыны. У XIX ст. ён быў больш вядомы ўжо ў лацінамоўных копіях, з якіх да сярэдзіны XX ст. дайшоў толькі кепска захаваны фрагмент з архіва Грэцкай калегіі ў Рыме. Тэкст



***ЛІСЕЙЧЫКАЎ Дзяніс Васільевіч.***

*Намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1979 г. у в. Дзяніскавічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. У 2001 г. скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2002 г. — магістратуру пры названым факультэце, у 2006 г. — аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святарства беларуска-літоўскіх зямель (1720—1839 гг.)". Аўтар манаграфій "Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720—1839 гг." (Мн., 2011), "Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596—1839 гг." (Мн., 2015) і больш за 50 іншых навуковых публікацый, у тым ліку калектыўных манаграфій і зборнікаў дакументаў. Лаўрэат прэміі III Міжнароднага кангрэса даследчыкаў Беларусі (г. Каўнас, Літва, 2013 г.) за найлепшую манаграфію ў намінацыі "Гісторыя" і літаратурнай прэміі імя Ф.Багушэвіча (2016) за лепшую гістарычную прозу.*

гэтага фрагмента ў 1956 г. быў апублікаваны рымскімі базыльянамі[3]. У рукапісе 1636 г. згадваецца і ранейшы мітрапалітаў тастамент, складзены, як ён піша, "*в Холме... если добре помню*". Памяць крыху падвяла ўладыку Іосіфа, бо гэтым "холмскім" тастаментам з'яўляецца публікуемы намі дакумент, які быў напісаны мітрапалітам у 1627 г. у маёнтку Белае Поле каля Холма. Як ні дзіўна, але пра яго наяўнасць у фондзе Канцылярыі мітрапаліта грэка-ўніяцкіх цэркваў у Расіі было добра вядома яшчэ ў канцы XIX ст.[4]. Прычым складальнікі тагачаснага вопісу асобна адзначалі, што гэта "*автограф — весь документ — митрополита Иосифа Вельямина Рутскаго, документ ветхий, но сохранивший текст вполне исправно*"[5]. Аднак тастамент 1627 г. не прыцягнуў увагу публікатараў і складальнікаў шматлікіх археаграфічных серый Расійскай Імперыі канца XIX — пачатку XX ст., паколькі яго юрыдычную моц фактычна скасоўваў пазнейшы тастамент.

Падрабязны разгляд падзелу маёмасці, які змяшчае тастамент 1627 г., не мае практычнага сэнсу, паколькі ўсе яго рашэнні былі ануляваныя пазнейшым тастаментам, зместам якога і кіраваліся ў далейшым душапрыказчыкі мітрапаліта[6]. Для нас найбольшую цікавасць уяўляюць тыя часткі дакумента, дзе Руцкі разважае, прыгадвае і рэфлексуе над рознымі падзеямі ў сваім жыцці і ў жыцці уніяцкай царквы і Рэчы Паспалітай.

Бадай, самы галоўны сюжэт тастамента 1627 г. — гэта справа адукацыі. Складанне тастамента прыпала на той час, калі Руцкі займаўся актыўным пошукам сродкаў на новую мітрапаліцкую семінарыю, месцам стварэння якой быў абраны Менск[7]. Гэтаму папярэднічаў шэраг падзей у грамадскім і палітычным жыцці Рэчы Паспалітай. Па-першае, у 1617 г. мітрапаліт Іосіф распачаў надзвычай удалую рэформу ўсходняга манаства, нанова стварыў базыльянскі ордэн, да якога далучалася ўсё болей манастыроў, што заклала падмурак для далейшага развіцця царкоўных структур. Па-другое, у 1618 г. паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай было падпісана Дэулінскае перамір'е, паводле якога да апошняй адыходзілі Смаленск, Чарнігаў, Дарагабуж і іншыя гарады з навакольнымі землямі, што давала магчымасць распаўсюджваць уніяцтва на новыя тэрыторыі. Па-трэцяе, пасля аднаўлення праваслаўнай іерархіі і структур Кіеўскай праваслаўнай мітраполіі ў 1620 г. з'явілася пільная неабходнасць стварэння новых інтэлектуальных цэнтраў уніяцкай царквы (апрача Вільні). Па-чацвёртае, пасля забойства ў 1623 г. у Віцебску полацкага ўніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча папскі пасад і дзяржаўныя ўлады Рэчы Паспалітай былі як ніколі зацікаўленыя ва ўмацаванні ўніяцкіх структур. Урэшце, маштабны ўніяцкі царкоўны сабор, які адбыўся ў верасні 1626 г. у Кобрыне, абавязаў падначаленае духавенства ахвяраваць частку сваіх прыбыткаў на адкрыццё новай семінарыі. Больш дэталёва гэтае рашэнне было замацавана на саборы ў Навагарадку, які адбыўся ў кастрычніку таго ж года і пастановы якога падпісалі два пратапопы і 21 святар[8]. Такім чынам, адкрыццё мітрапаліцкай семінарыі ў Менску ў 1627 г. было для ўладыкі Іосіфа першаснай задачай. Таму не дзіўна, што ён згадвае яе ў тастаменце аж сем разоў. Часта з вялікім спадзевам на адукацыйны патэнцыял будучай установы. Гаворачы, што ў Вільні добра падрыхтаванае духавенства можна было ўзяць толькі з ліку манахаў Траецкага манастыра, Руцкі піша: "*же семинарыумъ еще не было, которое тепер за Божю помочю быт мусит*"[9]. Рэальную дзейнасць семінарыя распачала толькі ў канцы 1640-х — пачатку 1650-х гг., але з пачаткам вайны з Маскоўскай дзяржавай у 1654 г. спыніла сваё існаванне, хоць праекты яе аднаўлення праіснавалі да канца XVII ст.[10].

Увогуле, добрая духоўная адукацыя, на думку Руцкага, з'яўляецца вельмі істотным набыткам. Настолькі каштоўным, што гарантыі яе атрымання для абраных мітрапалітам асоб пералічваюцца ўпоравень з матэрыяльнымі падараваннямі. Аддзячыць чалавеку ў тастаменце можна забеспячэннем адукацыі ягоным дзецям. Так, гаворачы пра Жыгімонта Брацішэўскага, Руцкі піша: "*вдячност чым колвек указат, если не в чом иншом, теды взятемъ которого з способнеишых сынков его на преизрене свое и которого бы он офяровал на службу Божую*"[11]. Узгадваючы сваю родную сястру Ганну, якая была замужам за Марцінам Тупальскім, мітрапаліт таксама заўважае: "*также и их сынка если бы згожыи был до наукъ, и если бы воля их была офяроват на службу Божую, взяти до семинарыумъ, а потом и далеи опекати ся имъ*"[12]. Уладыка Іосіф таксама клапоціцца пра навуку сваякоў і па бацькоўскай лініі — Вельямінаў, і па матчынай лініі — Совічаў-Корсакаў: "*жебы з дому отца моего Веляминовского завше один месце мел в семинарыумъ нашым, где наукъ латинских учыти будут, а потом, кгды згожыи будет, жебы был посланыи и до краев посторонных на тые месца, которые за працею моею и ласкою Отца Святого набытые сут. З дому зась матки моее Корсаковского жебы за старанем их месце мел один в Вилни в семинарыумъ Корсаковским*"[13]. Пазнейшы тастамент — 1636 г. — таксама не абмінае клопату пра адукацыю — ён прадугледжвае ўтрыманне пры Віленскай саборнай царкве *"рускай школы"*: "*Так же школа руская пры церкви соборнои жебы была и страва обмышлена была на двух клирыков руских, которые бы до школ ходили и учылися языка латинского и иншых наук, але жебы первеи речы руские умели*"[14].

Наступнай паводле важнасці задачай пасля стварэння Менскай семінарыі мітрапаліт называе пабудову і ўтрыманне пастаяннай мітрапаліцкай рэзідэнцыі ў Рыме: "*спорядившы семинарыумъ взяти ся дужо за резыденцыю рымскую*"[15]. Тастамент вызначае выдаткі на рамонт і іншых важных для цэлай мітраполіі будынкаў. У першую чаргу — кафедральнай цар-




*І.Вельямін-Руцкі. Гравюра з кнігі "Specimen Ecclesiae Ruthenicae". Рым, 1733 г. (фота М.Нікалаева).*

квы Святых Барыса і Глеба ў Навагр252радку "*на оправу церкви мурованое пры дворе митрополемъ в Новагородку*"[16]. Адзначаюцца высокія прафесійныя навыкі ў арганізацыі будаўнічых работ айца Яўстахія Пяшкоўскага "*яко зычливого, пилного и працовитого делателя, которогом добре дозналъ в мурованю церкви и економии*"[17]. Асоба айца Яўстахія як мітрапаліцкага аканома ў станоўчым святле ўзгадваецца і ў тастаменце 1636 г. З канца 1630-х гг. і да сваёй смерці ў пачатку 1650-х гг. ён адначасова з'яўляўся і архімандрытам базыльянскага Каложскага манастыра ў Гародні. Другі важны храм, выдаткі на які агаворвае тастамент, гэта кафедральная царква Успення Багародзіцы ў Вільні. Узгадваюцца наступствы вялікага пажару і пашкоджанні даху храма, якія трэба неадкладна паправіць: "*перво потреба церковъ оправит по деяком огню и по спадненю щыта*"[18]. Па-сутнасці, гэтыя дзве царквы з'яўляліся на той час галоўнымі храмамі ўсёй Кіеўскай уніяцкай мітраполіі. Узгадвае мітрапаліт і віленскі мураваны дом купцоў Мамонічаў, у якім да пачатку 1620-х гг. дзейнічала знакамітая друкарня: "*на купене иншое маетности обернена ест каменица Мамоничовская*"[19].

Асаблівую цікавасць уяўляюць роздумы Руцкага наконт ролі манарха Рэчы Паспалітай Жыгімонта Вазы ва ўсёй уніяцкай справе. Ад моманту падпісання акта ўніі ў Берасці ў 1596 г. прайшло ўжо больш за трыццаць гадоў, на мітрапаліцкім стальцы змянілася тры чалавекі, а ўніяцкі праект усё яшчэ быў далёкі ад свайго завяршэння. Мітрапаліт выказвае спадзяванні, што ўніяцкая справа, якая распачалася пры гэтым

**Іосіф (у свеце Ян) Вельямін-Руцкі**

Нарадзіўся ў 1574 г. у родавым маёнтку Рута Навагрудскага павета ў сям'і кальвіністаў Шчаснага (Фелікса) Вельяміна-Руцкага і Багумілы Совіч-Корсак. Памёр 5 лютага 1637 г. у Дзерманскім манастыры на Валыні. Пахаваны ў Вільні.

Вучыўся ў кальвінісцкіх школах у Нясвіжы і Вільні. У час навучання ў Карлавым універсітэце ў Празе (1590-я гг.) перайшоў у каталіцызм. Вывучаў філасофію ў Вюрцбургу. У 1603 г. скончыў курс тэалогіі ў Грэчаскім калегіуме Св. Афанасія ў Рыме.

Паводле рэкамендацыі Папы Рымскага Клімента VIII перайшоў у візантыйскі абрад. Вярнуўшыся ў Вялікае Княства Літоўскае, займаў пасаду рэктара духоўнай семінарыі ў Вільні. У 1605—1606 гг. наведаў у складзе пасольства Маскоўскую дзяржаву. З 1607 г. жыў пры манастыры Св. Тройцы ў Вільні, дзе ў 1608 г. быў пастрыжаны ў манахі пад імем Іосіф. Праз некаторы час стаў архімандрытам названага манастыра. З 1614 г. — мітрапаліт Кіеўскі, Галіцкі і Усёй Русі. У 1616—1617 гг. правёў рэформу манаства. У выніку яе быў створаны базыльянскі ордэн, манастыры выводзіліся з-пад юрысдыкцыі епіскапаў і былі аб'яднаны ў Кангрэгацыю Св. Тройцы на чале з протаархімандрытам, які абіраўся пажыццёва. У далейшым Вельямін-Руцкі дамогся ад караля, каб епіскапскія кафедры ва ўніяцкай царкве займалі толькі базыльяне. Стварыў сістэму адукацыі ва ўніяцкай царкве. Дамогся ад папскага пасаду атрымання уніяцкімі школамі роўных правоў з езуіцкімі, у выніку чаго пры многіх манастырах былі заснаваны школы ніжэйшай ступені, а ў Менску адчынена тэалагічная школа, а пазней — духоўная семінарыя. Актыўна ўдзельнічаў у палеміцы з праваслаўнымі інтэлектуаламі. Аўтар кніг "Падвойная віна" і "Экзамен абароны". Здолеў пераканаць галоўнага праваслаўнага палеміста, полацкага архіепіскапа М.Сматрыцкага, прыняць унію. Ініцыятар працэсу беатыфікацыі забітага ў 1623 г. полацкага ўніяцкага архіепіскапа І.Кунцэвіча і папулярызатар яго культу. З'яўляўся ініцыятарам стварэння Кіеўскага патрыярхату, які мусіў аб'яднаць "дзве Русі", уніяцкую і неўніяцкую. Руцкім быў закладзены падмурак і структура царкоўнага кіравання, якія на шмат дзесяцігоддзяў наперад вызначылі развіццё уніяцкай царквы ў Рэчы Паспалітай. Адпісаны на патрэбы Кіеўскай уніяцкай мітраполіі родавы маёнтак Рута істотна ўзмацніў эканамічныя магчымасці будучых мітрапалітаў.

манарху, удала скончыцца яшчэ пры яго жыцці: "*жебы едност святую яко сам зачал, так помоглъ жебы за жывота его скончона была*"[20]. У гэтым месцы Руцкі падыходзіць да самага, на наш погляд, цікавага вобразу ўсяго тастамента. Ён піша, што уніяцкая царква з Божай ласкі да гэтага часу вытрымала *"пяць галоўных штурмаў"*, а калі б уніяцкую ідэю не падтрымліваў сам Бог, то нават у адным з такіх "штурмаў" яна магла б загінуць. Цяжка з пэўнасцю сказаць, якіх пяць лёсавызначальных падзей у жыцці ўніяцкай царквы мае на ўвазе мітрапаліт. Верагодна, да іх можна аднесці бунты супраць мітрапаліта Іпація Пацея ў 1609 г., калі падпарадкоўвацца ўніяцкай іерархіі адначасова адмовілася духавенства некалькіх галоўных гарадоў ВКЛ, магілёўскае паўстанне 1618 г. супраць полацкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча, аднаўленне праваслаўнай іерархіі ў 1620 г., забойства Кунцэвіча ў Віцебску ў 1623 г. Магчыма, да ліку "штурмаў" адносіцца і забойства мітрапаліцкага намесніка ў Кіеве Антонія Граковіча ў 1618 г. Так ці іначай, Руцкі канстатуе, што пасля кожнага з пяці штурмаў Царква не толькі выстаяла, але і ўмацавалася: "*выдержала без шкоды и овшем с помноженемъ своим добра заисте надея же Бог ест с нею*"[21].

Ад ролі і месца манарха ва ўніяцкай справе Руцкі плаўна пераходзіць да гарантыі поспеху гэтых пачынанняў — каб манарх ва ўсім прыслухоўваўся да кіеўскага мітрапаліта. На епіскапскія стальцы трэба прызначаць толькі тых, каго парэкамендуе мітрапаліт, "*кто бовем персонъ руских згожых на тот уряд лепшъ знат может яко митрополита*"[22]. Сваёй заслугай Руцкі называе тое, што ад самых пачаткаў хрысціянства нікому ніколі не ўдавалася дасягнуць у грэцкай царкве, каб усе епіскапы мелі багаслоўскую адукацыю: "*на каждои столицы епископскои за митрополии моеи епископ феолог и отправуючыи пилне уряд свои*"[23]. Пасля разважанняў над роляй мітрапаліта ў жыцці ўсёй русінскай супольнасці Рэчы Паспалітай уладыка Іосіф пераходзіць да разгляду яшчэ аднаго цікавага сюжэта. Паводле яго сапраўдным сэрцам Кіеўскай мітраполіі замест Кіева ўжо даўно служыць Вільня. Менавіта ў Вільню ў якасці мітрапаліцкай сталіцы павінны былі ў першую чаргу прыязджаць новапастаўленыя іерархі. "*Не до Киева, але до Вилна*" нібыта загадваў мітрапалітам прыязджаць сваім прывілеем яшчэ кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Стары ў пачатку XVI ст. Выкраданне арыгінала гэтага прывілея з рызніцы кафедральнай царквы Святых Барыса і Глеба ў Наваградку, як сцвярджае Руцкі, было асноўнай місіяй праваслаўных кіеўскіх манахаў, якія з'явіліся ў горадзе ў 1609 г. Мітрапаліт апісвае і свой урачысты ўезд у Вільню ў якасці новага кіраўніка Кіеўскай мітраполіі ў 1614 г.: "*небощык ксендз Воина, бискуп виленскии, спрыял ми и информацыю ми давал што и яком мел чынит учынилъ, же сенаторове выехали в поле, а поготовю рада месцкая, самъ зась з иншыми паны сенаторы и депутатами чекалъ пред брамою у олтара на то прыготованого*"[24]. Саму ж Кіеўскую мітраполію Руцкі называе сваёй абранніцай, фактычна сужэнкай: "*тое все записую митрополии, яко облюбеницы от Бога мне данои*"[25]. Утрымлівае тастамент і безліч дробязей, якія дазваляюць глыбей акрэсліць пэўныя моманты штодзённага жыцця яго складальніка, напрыклад імёны яго служак: стайняй і коньмі загадваў Лукаш Сялява, ежай і кухняй — Рыгор Вугловіч, вопраткай і пакаёвымі рэчамі — Арцемій Катлубай, а кіраваў штатам мітрапалітавых служак Ян Слупскі. Відавочна, гэта былі асобы шляхецкага паходжання, бо побач з імі мітрапаліт прыгадвае без прозвішчаў і свайго фурмана Яську і гайдука Багдана, які да таго ж прыслужваў Руцкаму ў якасці пекара.

Дакумент з'яўляецца яскравым прыкладам духоўнага запавету — гэта не проста лаканічны тастамент з пералічэннем распараджэнняў эканамічнага характару. Па-сутнасці, гэта праграмны дакумент кіраўніка ўсёй русінскай супольнасці Рэчы Паспалітай. У ім напоўніцу праявіўся пісьменніцкі талент Іосіфа Вельяміна-Руцкага — акрэслены асноўныя праблемы Кіеўскай уніяцкай мітраполіі, сфармуляваны галоўныя выклікі, якія ставіць перад ёй будучыня, пазначаны шляхі далейшага развіцця яе структур. Эмацыйнасць тастаменту была прадвызначана і часам яго складання — перыядам самага моцнага накалу ўніяцка-праваслаўнай палемікі, якую ўзмацніла нядаўняе забойства Іасафата Кунцэвіча. Якраз у 1627 г. пад уплывам Руцкага патаемна вызнае паслушэнства ўніяцкай іерархіі новы полацкі праваслаўны архіепіскап Мялецій Смятрыцкі. Але далейшыя поспехі ўніі ў гэты час яшчэ невідавочныя. У гэтым прынцыповая розніца двух тастаментаў мітрапаліта — 1627 і 1636 гг. Увядзенне ў навуковы ўжытак тэксту ранейшага тастаменту дазволіць лепш зразумець маштаб асобы Іосіфа Вельяміна-Руцкага і дадасць новых фарбаў у апісанне міжканфесійных адносін у няпросты перыяд жыцця грамадства ВКЛ.

---

[1] Завещания униатских иерархов киевской митрополии XVII и XVIII вв. как пример религиозной культуры общества Речи Посполитой. Люблин, 2013; Лісейчыкаў Д.В. Мітрапаліт Іосіф Вельямін-Руцкі і яго тастамент // Асоба і час: Беларускі біяграфічны альманах. Вып. 2. Мінск, 2010. С. 33—49; Лісейчыкаў Д.В. Фрагмент архіва маёнтка Рута Наваградскага павета XVI—XVIII стст. у фондзе Наваградскага павятовага земскага суда // Дакументальная спадчына Беларусі XIV—XX стагоддзяў. Мінск, 2014. С. 190—202.

[2] Лісейчыкаў Д.В. Мітрапаліт Іосіф Вельямін-Руцкі і яго тастамент; Завещания униатских иерархов киевской митрополии XVII и XVIII вв. как пример религиозной культуры общества Речи Посполитой. С. 47—73.

[3] Epistolae Josephi Velamin Rutskyj, metropolitae Kioviensis catholici (1613—1637) / Collegerunt adnotationibus illustrarunt et introductione auxerunt r.p. Theodosius T. Haluščynskyj — p. Athanasius G. Welykyj, Ordinis S. Basilii Magni. Romae, 1956. P. 383—384.

[4] Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. Т. 1. 1470—1700. Санкт-Петербург, 1897. С. 201.
[5] Там жа.
[6] Лісейчыкаў Д.В. Мітрапаліт Іосіф Вельямін-Руцкі і яго тастамент.
[7] Головацький Р., ЧСВВ. Митрополича семінарія Рутського // Analecta Ordinis S. Basilii Magni. Vol. III (IX). Fasc. 3—4. Romae, 1960. С. 375—393.
[8] Российский государственный исторический архив (далей — РГИА). Ф. 823, оп. 1, д. 536.
[9] Там жа. Д. 541, л. 4.
[10] Головацький Р., ЧСВВ. Митрополича семінарія Рутського.
[11] РГИА. Ф. 823, оп. 1, д. 541, л. 2.
[12] Там жа. Л. 2 об.
[13] Там жа.
[14] Лісейчыкаў Д.В. Мітрапаліт Іосіф Вельямін-Руцкі і яго тастамент. С. 46.
[15] РГИА. Ф. 823, оп. 1, д. 541, л. 3 об.
[16] Там жа. Л. 1 об.
[17] Там жа. Л. 4.
[18] Там жа.
[19] Там жа. Л. 2 об.
[20] Там жа. Л. 3.
[21] Там жа.
[22] Там жа.
[23] Там жа.
[24] Там жа. Л. 3 об.
[25] Там жа. Л. 1 об.

*Дадатак*

**Тастамент мітрапаліта Кіеўскага, Галіцкага і Усёй Русі Іосіфа Вельяміна-Руцкага.**

1627 г. сакавіка 20. Маёнтак Белае Поле Рускага ваяводства Каралеўства Польскага.

Российский государственный исторический архив. Ф. 823. Оп. 1. Д. 541. Лл. 1 — 4 об.

[л. 1] Во имѧ С(вя)тое Жывотворѧщее и Неразделимое Троицы, Ѡтца и С(ы)на и С(вя)того Духа, | пишү сию хартыю wстатнее воли мое, хотѧчы и w тое просѧчы, же|бы выконана была wт тых, которым то належати будет. |

Наипервеи ѧком записами правными и прызнаными записал маетности, | лежащые так мои wтчыстые, ѧко и набытые, на Церковъ Божүю, так | и тым рүкописанием моимъ ствержаю. Толко жъ тот, которомү то на|лежат будет, воити мает правне в державье зараз по смерти моеи, и кгдыж | ѧ зоставилъ собе в обудвух записахъ волное үжыване того до смерти, | а иж записүючы имене мое дедичное Рүту, мелъ есми үмыслъ напро|тив того зоставити што колвек сестре моеи рожонои п(а)неи Анне Велѧми|новне Рүтскои Мартиновои Түпалскои, также сестранце рожонои п(а)неи Анне | Юражанце Ѧновои Булгаковои, нагорожаючы то, же тое имене Рүта во|длугъ записов моих вечне wт них wтходит. Теды тым теперешним писмом | моим на тое имене Рүту вношу чотыры тисѧчы золотых полских, с ко|торых тры тисѧчы wтдана быт мает сестре моеи вышеи помененои, а wдна | тисѧча сестранце Анне Юражанце, если бы пры фолварку Пересеце под ме|стом Новагородскомъ лежачымъ, а до митрополии належачымъ, не | зостали. А если бы зостали, w што ѧ наступника моего прошу, теды мает | имъ на том фолварку записана быт тисѧча золотых, которые үже wтда|ны сут wт мене тому, кому водлуг права належали, пораховавшы в то | бүдоване теперешнее и засевокъ по прошлом поссессоре позосталыи. | А пры тым можна ли дожывоте самому п(а)нү Ѧну Булгакови и мал|жонце его, а сестранце моеи выш реченои. А если бы то не можна, теды | w тое прошү, жебы наступник мои свое дожывоте им записал, то ест | жебы wни беспечни были, же их нихто с того не рүшыт, покул наступни|кови моему Пан Бог жывота продолжыт. Што варовавшы записами | вжо Рүта wт плаченѧ того тисѧча золотых волна зостанет, а толко | тры тисѧчы сестре моеи плачоны быт мают на певныи часъ, то ест | в пѧть летъ по смерти моеи. А ѧком потребовал по згромаженю | законномъ виленском С(вя)тое Жывоначалное Троицы, жебы Рүту, имене, ко|торое wт мене им ест записано, үступили митрополите, взѧвшы против|ко того Лаврышов монастыр, такъ и тепер прошу, жебы так үчынили, | бо ѧ добре ведаю, же митрополита, если ему тое имене Рүта | до митрополии поступлено не будет, не wбыидетсѧ жадным спо|собом без Лаврышова, а подобнеишаѧ иноком монастыр держать. | До того ѧкие тежары вложоные сут на Рүту сами видет могут, || [л. 1 об.] а вложоны с потребы w чом мавѧлосѧ з многими үстне и для того | не ест потреба тут мѧноват. А иж неровно болшъ записуетсѧ сестре ниж | сестренце, могут сами ведат прычыны, длѧ того тут не кладү. Кото|раѧ тры тисечы золотыхъ мает быт wт державого именѧ того Рүты | быт wтдана wт днѧ смерти моее, если бым в року теперешнем, ҂ах (16) | двадцат семом, үмерлъ, за лет пѧт, бо до чотырохъ лет wт року про|шлого, ҂ахкs (1626), доходы с того именѧ прыходѧчые назначоны сут wт мене | на семинарыүмъ рүское Менское, так теж на wправу церкви мүрова|ное пры дворе митрополемъ в Новагородку. А право на фолварк | митрополии Пересеку зараз по наступеню прышлого митрополиты | по смерти моеи дано быт мает. А тисеча золотых, которүю митро|полита на Пересеце запишет, wдыскиват мает з Рүты, и державыи того | именѧ по выистью права даного сестранце моеи wт митрополита | на Пересекү, тот фолваркъ Пересеку ү детеи ее або ү того, кому то wн | запишет, выкупит и митрополите wтдат повинен будет. Если теж до | митрополии Рүта достанетсѧ, чого ѧ зычү, способомъ вышеи писаным, | то сам митрополита собе выкупит, давшы им тисечо золотых, не крыв|дѧчы ихъ, ведаючы то wт мене и верүючы мне же тымъ үмысло(м) | за радою wдного с(вя)тобливого ч(е)л(о)века Рүта wт мене на Церковъ записа(на) | ест. Жем ѧ мелъ з иншое меры сестре и сестранце моеи за жывота | еще своего нагородит, ѧко ж и тепер если ми Г(оспо)д Бог даст пожыт пѧт | лет, надеваюсѧ тот үвесь тежар знести с того именѧ Рүты. |

Речы мои рүхомые вси wт мала до велика, то ест кони, возы, шаты, | золото, серебро, цынү, мед, wбитѧ по-

коевые и што колвекъ речю рү|хомою назватсæ может, кладүчы в то и wбликги людские на долги | певные, тое все записую митрополии, æко wблюбеницы wт Б(ог)а мне | данои. Што все wт челæди моее wдобрат мает wтец Рафаил Кор|сак, коадютор мои, мне wт Ѿтца С(вя)того Папы Рымского, а потом wт | королæ его м(и)л(ости) на митрополию Киевскую, Галицкүю и Всеæ Рүси | з правом до наступованæ на нее по смерти моеи даныи. Речми стаен|ными заведает Лүкаш Селæва, кухенными Григореи Үглович, шат|ми и речми покоевыми Артеми Котлубаи, а над ними старшыи | и которому рæд всего порүчоныи ест Æн Слупъскии. Того же ведат бу|дет, комү речы столовые в тот часъ поручоны будүть и того постере||[л. 2]чы мает, жебы все сполна wтдано было, и реестра всих тых речеи | в шкатуле пры мне, и тые, которые всим тым заведывают, верными завше | были. Челæди моеи всеи поплачоно быт мает над тые сүхи дни, в ко|торых мене смерть заидет, двои над то каждому даны быт мают. А за барву, которым сæ таæ дает, грошми wтдати потреба вѣдлуг баченæ, а жалоба на | всихъ дана быт мает. Слупскому за цалыи прошлыи рок зосталемъ винен | сто золотых полских. Ѿтдат ихъ потреба и з иншое меры мет взглæд на него | и на иншых всих, кгдыжъ ми добре служыли и wт давных часовъ многие ихъ | служат, на которыхъ болшыи взглæд мет потреба. Вшак же без тежарү своего | и поволи маеть то wтправоват wтец коадъютор, которые бы тежъ ему | хотели служыт, нехаи их прыимет и карточки роздаст же их на потом, кгды | грошы мет будет, доидет што на тых картках то менит. Если теж пры мне в шка|туле æкие грошы зостанут, на тое ж wбернены быт мают. Возница Æсько, | которыи мене вожывалъ, годен баченæ, хотæ ж разов со два порывалсæ wт | мене. Терпливост и працовитаæ служба Богдана гаидүка, бо и гаидуком был, и | пекаром, а служыл үпреиме и без шемранæ завше што ему казано было wт|правовал, великое похвалы и нагороды годны ест, по силе своеи, котораæ | ведаю иж щүплаæ ест wтец коадютор нагородит. П(а)нү Жыкгмунтови | Братишевскому, которыи мне и Церкви Божои үпреиме и пилне служылъ, вдæ|чност чым колвек үказат, если не в чом иншом, теды взæтемъ которого з спо|собнеиших сынков его на преизрене свое и которого бы wн wфæровал на службу | Божүю.

По смерти моеи wтец коадютор нехаи wзнаимит | сестре и сестранце моеи, же сæ им записует то, штом вышеи наменил, так|же и копии записов моих так на Рүту, æко на Түпалы и иншые пры|күпли, нехаи имъ пошлет, против которым если бы сæ важыли што чы|нит на затруднене тых, которым то записано не толко кгвалтом, што по|чынаючы, але и до права потегаючы тым самым wт того, што им запи|сано ест симъ тестаментом моим wтпадают и ничого вжо им не мает | быт дано. А чым бы сæ ү права боронит наидут в скрынце справ рутскихъ | сестранки зречене з добръ wтчыстых и матерыстых прызваное ест в тои | скрынце длæ того теж ест дано wт мене имене Үзда со всим wсподар|ством и спратом домовым. В чом үкрывдилем и сестрү и длæ того ест болшъ | тепер записүю, wпроч иншых прычын и wбетницы моеи үчыненои ест, таæ | зась хочъ не чынила зреченæ, але дошол ее посаг болшыи ниж wтецъ | мои тестаментом своим wписал и внесеныи тот посаг на третюю част именæ | п(а)на Мартина Түпалского, малжонка ее, котораæ и тепер вцале естъ || [л. 2 об.] и хоч бы был посаг не дошол не взела бы так много и з декретү сүдового æк æ тепер | записую, бо брат сестрам не повинен дат болшъ над четвертую част, а сестръ было | две, то зъ wсмое части выправа, нехаи же шацүют две части Рүты по wтцы | нашом нам зосталое, с которых дву частеи ест теперешнеи сестре моеи wсмаæ бы | част належала, бо третææ част ү стры(æ) п(а)на Миколаæ Велæмина | Рутского по смерти wтца моего wт мене куплена ест. Заставы тежъ водлуг права | до того не належат. Тое все выписавшы, послат п(а)ну швакгрови и п(а)неи сестре так|же и их сынка если бы згожыи был до наүкъ, и если бы волæ их была wфæроват | на службу Божүю, взæти до семинарыүмъ, а потом и далеи wпекати сæ имъ. | А иж вечную памæткү з домү моего мети бүдет Церковъ Божаæ Рүту и Түпалы | хотæ ж и wтдаст то, што симъ писанием моим назначоно ест бүдет, wднак мет добрую | подпорү, не вспоминаючы сумы чотырох тисæчеи золотыхъ, которые по wтцү | моемъ мне достали сæ, а потом за тое wт мене куплена ест и на монастыр Ви|ленскии С(вя)т(ои) Троицы wтдана, а потомъ wт монастыра на күпене иншое маетности | wбернена ест каменица Мамоничовскаæ. Прошу наступъника моего и тых, ко|торые по ним бүдут, также згромаженæ законного С(вя)т(ое) Жывон(ачалное) Троицы Виленского, | жебы з домү wтца моего Велæминовского завше wдин месце мел в семина|рыүмъ н(а)шым, где наүкъ латинских үчыти бүдут, а потом, кгды згожыи будет, | жебы был посланыи и до краев посторонных на тые месца, которые за працею | моею и ласкою Ѿтца С(вя)того набытые сут. З домү зась матки моее Корса|ковского жебы за старанем их месце мел wдин в Вилни в семинарыүмъ Ко(р)са|ковским. Жебы тот дом Корсаковъ Совичовъ, æко тепер повинноватцвом з домом | п(а)нов Корсаковъ полоцкихъ звæзаныи ест, а наближшым з фундатором тое бурсы | небощыком Æном Корсакомъ, судею wшмæнским, так и на потом жебы того | добродеиства въ wдпои wсобе домү своего зажывал. Што длæ памæти ве|комъ потомным прошү, жебы wсобливым листомъ варовано было естли сæ | бүдет видело, а того листу автентыки в тых домах хованы быти мают. |

По смерти моеи зараз wтец Корсак, коадютор мои, за правом своим нехаи берет | в моц свою вси именæ и фолварки так в Короне Полскои, æко и в Вел(иком) Кнæз(стве) Лит(овском), | давшы впрод актыковат прывилеи свои коадюториæлныи там, где ему ближеи | бүдет и взæвшы выписов автентычных иле потреба будет үказовала на розе|слане в розные стороны, где именæ митрополие сут, розеслат их жебы үрæ|ды замковые не втрүчалисæ в то, æко звыкли были втрүчати сæ з великою | шкодою Церкви Божое. Потом без wтволоки нехаи едет до королæ его м(и)л(ости), | ҉(ендза) лекгата, п(а)нов печатаров, которые пры королю его м(и)л(ости) на тот час

будут. Коро||[л. 3]лю его м(и)л(ости) поведити, ѧком был вернымъ подданым и зычливым ему за жы|вота моего так кгды мѧ Г(оспо)д Бог сподобит видет лице свое, хочү быти | слугою его пред Маестатом Божым, жебы единост с(вя)тую ѧко сам зачал, так по|моглъ жебы за жывота его скончона была, в чомъ ему надею үчынит и | серца ѧко ч(е)л(о)векови додат если пѧт так головных штурмовъ выдержала без | шкоды и wвшем с помноженемъ своим добра заисте надеѧ же Бог ест з нею, без | его бовем помочы певне бы въ единомъ с тых штурмовъ үстала. Ѡ то | wсобливе и пилно просити мает, жебы ѧко до тых часов жадного не прыимовал на | владыцтва поданого wт иншых, толко кого митрополита способным быт ро|зүмелъ залетил, а корол его м(и)л(ость) прынѧл. Затым такие сѧ пожытки сталы | в релии грецкои, ѧкие подобно wт зачатѧ Веры Хр(естия)ньское в неи не были — | на каждои столицы еп(и)с(ко)пскои за митрополии моеи еп(и)с(ко)пъ феолог и wтправу|ючыи пилне үрѧд свои, што за иншых прошлых еп(и)с(ко)пов лѧдаѧко wтбирано wт | еп(и)с(ко)пии то wт теперешних мало не все ест wдыскано, тое ж и на потом бүдет, | кгды ласка его к(о)р(олевское) м(и)л(ости) будет подават таких, за ѧкими митрополита | прычынѧти сѧ будет. Ѡдержавшы такую wбетницү, а можна ли на писме, wт ко|ролѧ его м(и)л(ости), просит их м(и)л(остеи) п(а)нов печатаров, жебы тому прешкодою не были, | кгды ж не длѧ жадное перокгатывы, которое не прагнемо, тое чынимо, але | только шыре длѧ хвалы Божое, котораѧ без того сродку не толко помно|жона не будет, але и таѧ, котораѧ за ласкою Божою, а за старанемъ н(а)шым | ест, не задержыт сѧ. Кто бовем персонъ рүских згожых на тот үрѧд лепшъ знат | может ѧко митрополита, над то бы познатъ того не вытѧгано так | стисле жебы была шлѧхта або wбывателе тых краев, где еп(и)с(ко)пами будут, | нехаи үважают, же на тых початках единости w шлѧхту, котораѧ бы мела | в собе то, чого станъ еп(и)с(ко)пскии потребует, трудно быт мусит будет на потомъ, | даст Бог, лепеи кгды персонъ шлѧхецкихъ прыбудет, в чом старане чынимо | п(а)номъ печатаромъ забегат. Каждому, кгды наступит на тот үрѧд, поклонит | сѧ за wказыею, также и иншымъ, на которых залежыт. |

Порозумевшы сѧ з ꙃ(ендзом) лекгатом, послат до Рыму по конфирмацыю на | митрополию, на што будет ли потреба презентацыи wт королѧ его м(и)л(ости) до | Ѡтца С(вя)т(ого), ѧко wтрымывают ꙃ(ендзы) бискупи, wтрымат ее и до Рыму послат. | Ачъ теперешнему коадюторови не розумею того потребы, босмы то үже | wдержали в Рыме, толко жъ на писме не маемо, прынамнеи коли бы памѧт | того была в книгах ꙃ(ендза) лекгата. Мне трүдност үчынена была, бо без по|зволенѧ папеского үчыненым был коадюторомъ, и длѧ того конфирмацыи | не wдержаломъ аж в рок по смерти антецессора моего и потребовано, же|бым wтправовал тые ж соленнитатер, которые wтправуют ꙃ(ендзы) бискүпи пред || [л. 3 об.] пос(вя)щенемъ своим на бискупства, аж потом за листами прычынными снад королѧ | его м(и)л(ости). До чого значне и в неведомости моеи прычынил сѧ его м(и)л(ость) бискуп вилен|скии теперешнии, бүдүчы на тот час референдаром, же з Рымү написано, жебы | того процессу занехал ꙃ(ендз) лекгат и зараз ми wзнаимено, жебым по конфирмацыю, | котораѧ вжо прыслана была з Рыма, ехал до Варшавы, длѧ чого едүчы | до Варшавы потреба будет з собою взѧт конфирмацыю мою, также и буллү | на выдаване всих речеи с канцеллѧрыи рымское дармо. |

По wдержаню конфирмацыи старат сѧ мает wтправит въехане на митро|полию до Вилна. Ѧм ее wтправовалъ порѧдне, же небощык ꙃ(ендз) Воина, бискуп | виленскии, спрыѧл ми и информацыю ми давал што и ѧком мел чынит үчынилъ, | же сенаторове выехали в поле, а поготовю рада месцкаѧ, самъ зась | з иншыми п(а)ны сенаторы и депүтатами чекалъ пред брамою ү wлтара | на то прыготованого, также и тепер забечы его м(и)л(ости) ꙃ(ендзу) бискупови тепере|шнему и кому бы сѧ видело. Ест прывилеи wт Жыкгимонта Першого на въ|ежджане митрополите новому не до Киева, але до Вилна. Которыи то | прывилеи wт Павла, чернца схизматыцкого, из другим прывилеем выкраде|ныи ест з рызницы новгородское за выданем небощыка протопопы Новго|родского, и тепер без похыбы в брацтве ест. Ѧмъ его не моглъ wдыскат, | а ест потребныи, и wт того часу до Вилна въежджали вси митрополитове | ѧко до места столечного, которому вси панства руские а мѧновите Киев подлегали. |

Складанка на семинарыүмъ жебы през смерть мою не розрывала сѧ пилне | прошу. Нехаи наступник мои погорует трохү длѧ так великого добра, аж сѧ | зберет з митрополии wбецанаѧ десет тисѧчеи золотых, тут тежъ в Холмском | владыцтве зберет сѧ wбецанаѧ две тисѧчы, з гумна теперешнего wпрочъ | того, што сѧ үродит, толко ж на рок такую ж администрацыю выправит, ѧком | ѧ выправил, алем еще ничого не спенежыл, зараз же и наехат самому на тот фол|варкъ и мешкат в ним потреба. А если бы в дорозе забитым былъ wтец | Мефодии Терлецкии, ѧко сѧ тут носит межы жыдами, доведавшы сѧ пев|ное речы з Веднѧ, подат зараз иншого, а его үпевнит, же то што в гумне и | в стыртахъ, также засевку половица мает ити на семинарыүмъ и wн вы|моглъ еще задержат сѧ в монастыры, таѧ теж номинацыѧ может быт | таемна, жебы в посполитости не ведано. |

Спорѧдившы семинарыүмъ взѧти сѧ дүжо за резыденцыю рымскую, | на которүю зараз през ꙃ(ендза) лекгата просит королѧ его м(и)л(ость), жебы по смерти | каждого еп(и)с(ко)па нашого рүского волно было митрополите, заехавшы вла|дыцтво, выбрат доход wдного року, а то wборочат на фундацыю тое резиден|цыи, с чого на сыноде своем провинцыѧлном выличат сѧ пред иншыми еп(и)с(ко)пами || [л. 4] повинен будет. А ним до того прыидет, нехаи на прышлои конкгрекгацыи головнои наказана | будет такаѧ ж складанка на чотыры лета, ѧкаѧ тепер наказана ест на семина|рыүмъ. А з митрополии также доход киевскии през чотыры лета на тое ж wбер|нут и зараз на то wбернуть такемъ ѧ үмыслил если до того часу пожывү, | а законови то пилно залетит ѧко реч нам велце потребную wтцовъ влады|ковъ занехат, бо сѧ вжо противко тому некоторые wзвали, хоч еще не мовено им

| ничого. Ѿтца Евстахиѫ Пешковского пилне залецаю, ѫко зычливого, пил|ного и працовитого делателѫ, которогом добре дознал в мүрованю церкви и еко|номии, далем му лист дожывотныи на монастыр Выдүбицкии, нехаи пры | тым зоставает, на тых же працах пры митрополите будүчы, если здүжает, | што ему на волю дати.

Прыидет ми сѫ прыпоменути w клиросе митро|-полемъ, которого хотелом спорадити. Ѿпрочъ головнеишых, хотелом в Вилни мет пры | церкви соборнои накшталтъ мансиwнаров латинских, которые сполныи столъ мають, | а каждыи зособна юркгелтъ свои и келю с комороью каждыи wсобною. А может то быт въ | Вилне всих церквеи доходы въ wдно зложывшы, которыми бы мел wдин заведыват, | а до скрынки wдное збират и потомъ на страву, на юркгелты и потребы припадаю|щые дават, и личбу с того перед ними ж, с(вя)щенниками, чынит назавтреи по Үспению | Пречыстое. Два братѫ Котлубаеве, wбадва безженные, которых матка могла бы | быт господынею, мешкаючы ү С(вя)тое Пречыстое вси, а свои мешканѫ наимуючы, | которых доходов может быт золотых с тисеча, а до того прыложывшы доход церкви | Пѫтницкое, с которого слушне мает үступит монастыр, мѫновите кгды прыпа|дет о вси дом Сапежынскии, а хочбы не хотел үсту(…)[1] чого до|гадают сѫ потом. Ѫм wтлучил wт соборү болш и свецких попов не хотел мет | в Вилни, але все wтправоват през иноки на вечную памѫт wтступства попов | соборных всих wт продка моего митрополита Ипатиѫ, але сѫ то не надало, | бо и церкви пүстыми зостали. Монастыр досит үчынити, хочбы подобно хо|телъ не моглъ, wт людеи нарекане было, а што болшаѫ ү П(а)на Б(ог)а невеликаѫ | заслуга и вынищене чыну церковного в месте головном пры столечнои церкви | митрополеи. В тот же часъ вымовка была, же w годные с(вя)щенники, ѫких бы | тое место потребовало, трудно было, же монастыр, где досконалеи П(а)ну | Б(ог)у служоно, доходов потребовал, а не мел их з иншых сторон, же семинары|үмъ еще не было, которое тепер за Божю помочю быт мусит, с которого бы | клирошан згожых до того места выбрати сѫ могло. Немнеи сѫ на то wглeдат, | же в фундүшу шешолском wбовѫзок вложоныи ест на ховане с(вя)щенников не ледаѫких | и үжо былем ѫ үпомненыи вымовилом сѫ же перво потреба церковъ wправит | по деѫком wгню и по спадненю щыта, на што великого кошту потреба, а тепер | и тым сѫ вымавлѫт не можемо. Тых же клирошан посылат въ wбъезды по | всеи митрополии и жебы сүды порѫдные wтправовали, и книги судов своих мели. || [л. 4 об.] Молити сѫ Б(ог)у за дүшу мою и просит других, жебы сѫ молили, мѫновите тых законов, | до которых үчастництва заслуг по всим свете естем прынѫтым, то ест wтцов езүитов | и wтцов кармелитов босых, также Конкгрекгацыи ү wтцов езүитов, Розарыи ү wтцов | доминиканов и Кордикгерорум ү wтцов францышканов и бернадыновъ. Нехаи в тым үчынѫт | пилност братѫ возлюбленнаѫ, ведаючы же то им самымъ помочно будет, жебым наибор|жджеи прынѫтыи был до хвалы н(е)б(е)сное. Ѿ тое ж прошу и их м(и)л(о)стеи wтцов еп(и)с(ко)повъ, | братью мою милую. За тым всих великих и малых дүховных и свецкихъ П(а)ну Богү | въ wпекү его Боскую порүчаю и еслим кого wбразил делом або словом, або згоршылъ | кого, покорне прошу w прощене. Если теж хто мене wбразил, wтпүщаю ему wт всего серца | моего длѫ Х(рист)а П(а)на моего, и если бы сѫ што мне wт кого стало по том писаню моемъ, wтпүщаю | и прошу брати моее милое, жебы по смерти моеи нихто длѫ мене ничого не терпелъ. | А бл(аго)с(ло)вение м(и)л(о)стивого Б(о)га и мене, недостоиного слуги его, да бүдет со всеми вами. Амин. |

Писаныи ест тот список үвесь рүкою моею властною и подписанныи в Белом Полю, фол|варку еп(и)с(ко)пии Холмское. Лѣта wт нарож(еня) С(ы)на Божого ҂ахкз (1627) м(е)с(я)ца марца к(20) днѫ | во второкъ великии. |

Іwсифъ Велѫмин Рутскии, митрополита | Киевскии, Галицкии и Всеѫ Рүси, рүкою | властною. |

[1] Фрагмент страчаны.

*Аўтар выказвае падзяку Дзмітрыю Вінаходаву, Мікалаю Нікалаеву і Леаніду Цімашэнку за дапамогу ў пошуку дакументаў.*